У пачатку сакавіка дэлегацыя беларускіх журналістаў з недзяржаўных сталічных і рэгіянальных выданняў прыбыла ў колішнюю палітычную і сучасную культурную сталіцу Польшчы горад Кракаў (Krakow). Засяліўшыся ў гатэль "Ванда", мы мелі час наведаць знакаміты Вавель – Вавельскі каралеўскі замак 13-17 стагоддзяў. Праўда, у гэты ж дзень за вячэрай, як мы і прадчувалі, высветлілася, што не ўсе з нашай групы чулі пра рэзідэнцыю, дзе на польскі пасад каранаваліся ў тым ліку і князі Вялікага княства Літоўскага, напрыклад, Ягелоны – нашчадкі Ягайлы (1386-1572). Сумна, вядома, што работнік беларускага недзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва, маючы вышэйшую адукацыю і скураны плашчык, слова "Вавель" упершыню пачуў у Кракаве. Аднак папаўняць свае веды, як вядома, ніколі не позна. Дастаткова пагартаць хоць бы БелСЭ. Можна таксама звярнуцца да "Вялікай хронікі" пра Польшчу, Русь ды іх суседзяў XI-XIII стагоддзяў (выдавецтва Маскоўскага ўніверсітэта, 1987), якая паведамляе пра ўзнікненне старажытнага Кракава. Заснавальнікам горада, які ў 1320-1609 гадах быў польскай сталіцай, храніст называе легіта Крака. Імя гэта ў перакладзе з лацінскай мовы азначае "вялікая варона", "крук" альбо "крумкач". Крак, якога легіты абралі сваім каралём, заснаваў крэпасць на гары Вавель. З часам яна стала называцца Кракавам. На другім баку Віслы ёсць меншая гара, Вавельніца, на якой пабудаваны касцёл св.Міхала на Скальцы. Акрамя двух сыноў была ў Крака дачка Ванда, што ў перакладзе з лаціны азначае "кручок". Была яна вельмі прыгожай, што, аднак, не перашкаджала ёй кіраваць перанятым у спадчыну Польскім каралеўствам. Пра пекнату каралевы Ванды пачуў кароль народу алеманаў і вырашыў заваяваць яе калі не каханнем і грашыма, дык сілай зброі. Але не спужалася каралева легітаў, вывела свае войскі насустрач прагнаму чужаземцу. І тады пахіснуўся вораг у сваіх жаданнях, сумеўся ці то ад любові сваёй, ці ад крыўды і ўскліknуў: "Няхай Ванда кіруе морам, няхай зямлёй, няхай паветрам, няхай прыносіць ахвяры сваім несмяротным багам, а я за ўсіх вас, о вяльможныя, складу ўрачыстую ахвяру падземным багам каб, як як вы, гэтак і вашыя нашчадкі заўсёды знаходзіліся пад уладаю жанчыны". І пасля гэтых словаў кінуўся чужаземны кароль на меч і развітаўся з жыццём. А каралева Ванда, атрымаўшы ад алеманаў клятвы ў вернасці і васальнай залежнасці, вярнулася ў свой замак і склала багам такія ахвяры, якія адпавядалі яе вялікай славе і поспехам. Пасля гэтага яна скочыла ў раку Віслу і пераступіла парог падземнага царства, аддаўшы належнае чалавечай прыродзе.

Вось пра што варта ведаць, збіраючыся ў Кракаў да нашых польскіх калег.

На ўрачыстай сесіі

Семінар пад назваю "Польшча і Расія для Беларусі: роля недзяржаўных СМІ ў дэмакратычнай дзяржаве" пачаўся з урачыстай сесіі ў будынку гарадской мэрыі. Адкрыў яе старшыня Рады г. Кракава Станіслаў Гандлік. Дырэктар Кракаўскага Інстытута стратэгічных даследаванняў Міжнароднага цэнтра развіцця дэмакратыі Багдан Кліх заявіў, што ідэя семінара менавіта пад такой назвай нарадзілася ў яго і дэпутата расійскай Дзяржддумы Галіны Старавойтавай у час іх знаходжання на Тайвані. Нагадаю, што востраў Тайвань аддзяляе ад Кітая Тайваньская пратока, ад Філіпінаў – Паўднёва-Кітайскае мора, а ўсе разам названыя каардынатныя пункты знаходзяцца ў той частцы планеты, якую географы ды палітыкі называюць Азіяй. Пасля кароткай прамовы спадар Кліх прапанаваў нашаму экс-спікеру Станіславу Шушкевічу і Галіне Старавойтавай злучыць свае далоні як сімвал еднасці ў думках пра незалежную Беларусь.

Выступленне спадарыні Старавойтавай у мэрыі польскага горада месцамі выглядала як жаданне апраўдацца перад беларусамі, а месцамі насіла адкрыта правакацыйны характар. Старавойтава прызналася, што родам яна з вёскі Марозавічы Гомельскай вобласці, а ейныя дзед і бабуля пахаваныя ў г. Маладзечне. З відавочным задавальненнем прадстаўніца расійскага палітычнага бамонду хвалілася сваім сяброўствам з Алесем Адамовічам і Адамам Міхнікам, знаёмствам з Васілём Быкавым, заўважаючы пры гэтым, што "россияне всегда ощущали себя европейцами". Акрамя таго, наша зямлячка, чый аднафамілец у сталым веку мусіць перабываць у лукашэнкаўскіх засценках, паведаміла прысутным, што расійцаў хвалююць "надвигающиеся выборы в парламент Белоруссии", а таму яны, расійцы, павінны дапамагчы беларусам наладзіць сапраўды свабодныя выбары. На гэты пасаж наш Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч адказаў хоць і па-расійску, але як сапраўдны беларускі нацыяналіст: у сённяшняй сітуацыі выбары ў Беларусі не маюць сэнсу. І добра, што гэта разумее старшыня кантрольна-назіральнай групы АБСЕ паляк Браніслаў Герэмек. Спадар Шушкевіч сказаў, што для Беларусі палякі могуць зрабіць хоць бы і тое, што Захад у часы падпольнай "Салідарнасці" зрабіў для Польшчы.

На вуліцы Ісаака, 5

Пасля экскурсіі ў кантору рэгіянальнага кракаўскага аддзела рэдакцыі "Газеты выборчай", у якой працуе каля ста чалавек, работа семінара была прадоўжана ў своеасаблівым квартале, дзе знаходзяцца сінагога ды іншыя ўстановы кракаўскіх іўдзеяў.

Даволі канкрэтным было выступленне Часлава Акінчыца, стваральніка польскай радыёстанцыі на літоўскай тэрыторыі, якая дзейнічае ў радыусе 100 км,

РАМАН ГАРТ
ПРА КРАКА, ВАВЕЛЬ І КАРАЛЕВУ ВАНДУ

ахопліваючы частку прыпамежнай Беларусі з гарадамі Ліда й Наваградак. Спадар Акінчыц гатовы даць беларусам цэлую гадзіну бясплатнага эфіру і размясціць на літоўска-беларускай мяжы дадатковыя транслятары. Але рыхтаваць праграмы для вяшчання на Бацькаўшчыну беларусы павінны самі. Праўда, наш бок заўважае, што праблема тут не ў адсутнасці радыёжурналістаў, а ў аплаце іх працы, асабліва калі падрыхтоўка сюжэтаў будзе ажыццяўляцца ў Беларусі з наступнай перасылкай у Вільню.

І яшчэ цікавы факт паведаміў спадар Акінчыц. Пасля таго як ён уступіў у кантакт з віленскімі беларусамі і прапанаваў ім супрацоўніцтва, да яго заявіўся ні хто іншы, як беларускі пасол у Літве Бутэвіс і прапанаваў свае паслугі. Гэта магло азначаць і тое, што нехта з тых людзей, з якімі гаварыў Акінчыц, здаў смелага і практычнага паляка, а спецслужбы ў Беларусі, што не выключана, аператыўна выкарысталі інфармацыю і згулялі на апярэджанне.

У першы ж дзень семінара папрасіў слова колішні расійскі палітык і, зноў жа, наш зямляк Сяргей Станкевіч. Ён вельмі дынамічна й коратка змадэляваў адзін з горшых варыянтаў развіцця беларускай палітычнай сітуацыі ў блізкія два гады: частка апазіцыі будзе прыручана, другая падаўлена рэпрэсіямі. Станкевіч параіў дэмакратычную рыторыку падтрымліваць дзеяннямі, надаваць асаблівую ўвагу палітычным тэхналогіям, арганізоўвацца і вучыць арганізоўваць.

Калі Старавойтава абяцала ўмешвацца ў беларускія справы на падставе Венскай канвенцыі, дык польскія журналісты паводзілі сябе больш сціпла і толькі дзяліліся вопытам сваёй працы ў сацыялістычныя часы і цяпер. Былі адчытаныя спавешчанні пра этычныя і прававыя нормы ў незалежнай журналістыцы (Мацей Ілавецкі), этыку ў СМІ (Адам Шасткевіч), СМІ нацыянальных меншасцяў у Польшчы (Беата Клімкевіч), аўтарскае права ў Польшчы і яго журналісцкі аспект (Ева Навінская)...

Прыватныя дэталі ў аздобе грамадскага

Спачатку пра дэталі не толькі прыватныя, але і прыкрыя. Адна ўжо згадана – пра Вавель, які для некаторых нашых работнікаў СМІ усё яшчэ з"яўляецца зямлёю неспазнанай. Другая характэрная дэталь: пераважная бальшыня беларускіх журналістаў-семінарыстаў не ведае не тое што англійскай, нямецкай альбо французскай моваў, але, што асабліва непрыгожа, і польскай. Праўда, тут ёсць пэўная логіка. Польскай мовы не ведаюць, бо не ведаюць, альбо ведаюць, але не ўжываюць на практыцы, мовы беларускай.

Хоць нашы польскія таварышы і вырашылі падумаць, што можна зрабіць для Беларусі, але забяспечыць дакладную арганізацыю работы семінара ім не ўдалася настолькі, што ў дзень ад"езду мы ледзь не спазніліся на цягнік.

Прыкра й тое, што беларускага палітыка-апазіцыянера С.Шушкевіча некаторыя нашы журналісты не ведаюць ні ў твар, ні з патыліцы. Зрэшты, тут магло быць і горшае: грубы жарт на глебе непавагі. Маўляў, скажыце, а гэта хто такі?...

Прыемная дэталь: на вуліцах польскіх гарадоў можна паўдня вачыма стралящь, але ў паліцэйскага так і не патрапіш. Думаю, гэта таму, што грамадзянін польскі паліцэйскі службу служыць, а не сілу дэманструе.

Кур"ёзная дэталь: толькі ў дзень ад"езду мы заўважылі, што ў меню шведскага стала ўваходзяць не адны халодныя закускі, але й гарачыя кракаўскія кілбаскі. Крыху шкадавалі і столькі ж смяяліся.

Да ўсяго афіцыянт растлумачыў, што рыс у сальніцы насыпаны для таго, каб выконваць функцыю слікагеля, г.зн. усмоктваць вільгаць. Не, мы здагадваліся пра штосць падобнае, але мусілі перапытаць.

Сур"ёзная дэталь – палякі і хлеб. Я чуў, што ў Польшчы, як і далей на Захадзе, хлеба ўжываюць мала, наразаючы тонкімі лустачкамі. Але каб не падаваць яго на стол увогуле і нават за абедам – гэта занадта для маіх беларускіх апетытаў! Не, хлеб вам, вядома, пададуць, калі вы замовіце. Але будзе ён нейкі мяшаны, ні чорны, ні белы. Я рызыкнуў бы дзесьці параўнаць з турэмным, які выпякаюць з непрададзенага за дзень у хлебных аддзелах.

Антыкварыят... У такім старым горадзе яго шмат. Раскошная мэбля, сталовыя прыборы, золата, срэбра, парцаляна... У антыкварнай краме цікавей, чым у музеі: можна хадзіць вакол рэчаў, кратаць рукамі, адчуваць іх цяпло. У букіністычнай краме з таварышам цэлую гадзіну перабіраем старыя паштоўкі – шукаем з краявідамі "крэсаў усходніх" перыяду 20-х. Ёсць толькі паваенныя. Не тое. Але гаспадар крамы падказвае, як патрапіць у наступны букіністычны збор. Трапляем і хутка знаходзім патрэбнае. Даваенныя паштоўкі з выявамі заходнебеларускіх гарадоў акуратна, як і ўсе іншыя, запакаваныя ў цвёрды поліэтылен. Некаторыя фотаздымкі на паштоўках – вынік намаганняў фотамастака Яна Булгака. Гадоў семдзесят блукалі яны па Еўропе і вось цяпер вяртаюцца ў Беларусь. Мой таварыш набывае штук дзесяць, у сярэднім па дзесяць злотых за штуку. Яшчэ столькі ж застаецца ў краме. Я чамусьці раблю ўсвядомленае глупства і не купляю свае "крэсы" на картках. Па невялікім часе на дапамогу прыходзіць Фрэйд: я не купіў, бо спадзяюся прыехаць у Кракаў яшчэ не адзін раз.

Апошняя і самая прыемная нечаканасць. Развітальны абед у рэстарацыі "Хімера". Сядаем, уводзім арганізм у рэжым спажывання арганікі, падымаем позірк паверх галавы суседа... На сцяне насупраць роспіс: на сінім фоне срэбны коннік са шчытом, залаты крыж, меч у руцэ... Гэта «Пагоня» выпраўляе нас на Бацькаўшчыну.

У сакавіку 1794 года ў Кракаве пачалося нацыянальна-вызвольнае паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі.

Уладзімір Караткевіч так і не дапісаў свой раман "Зброя". І таму рана ставіць кропку...

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА
УКРАІНА

Украінскі нацыянальны медыя-клуб, фундацыя абароны свабоды слова і інфармацыі, украінскае незалежнае інфармацыйнае агенцтва "Рэспубліка" (УНІАР), цэнтр "Дэмакратычныя ініцыятывы" і прэс-цэнтр "Гарачая лінія" стварылі об"яднаны прэс-цэнтр "Выбары - 98".Па меркаванні яго кіраўніка Сяргея Набокі, прэс-цэнтр "дэмакратызуе працэс выбараў", паколькі інфармацыйныя сістэмы Украіны "дагэтуль пабудаваны таталітарна і кантралююцца ўладнымі структурамі". Па словах спадара Набокі, прэс-цэнтр – гэта недзяржаўная, пазапартыйная, пазаблокавая структура аператыўнага і аб"ектыўнага асвятлення працэсу выбараў.

Рэдакцыя газеты "Правда Украины" падала ў суд на прэзідэнта Украіны Леаніда Кучму за нанясенне ёй вышэйшай службовай асобай маральных стратаў, якія ацаніла ў суме 5 млн. грыўнаў. Выданне таксама падало ў суд на міністра інфармацыі Зіновія Куліка і яшчэ трох службовых асобаў, якіх газета абвінавачвае ў бяздзейнасці і парушэнні канстытуцыйнага права на свабоду слова. Падчас прэс-канферэнцыі дэпутат Вярхоўнай Рады Украіны Віктар Амеліч выказаў спадзяванне, што Савет Еўропы "дасць ацэнку злачыннай дзейнасці ўкраінскага ўрада і тых, хто знаходзіцца ва ўладзе".

Больш за ўсе на Украіне чытаюць раённыя, гарадскія і абласныя газеты, як паведаміла эксперт фонду "Дэмакратычныя ініцыятывы" Ірына Бекешкіна падчас семінара па выніках праекта фонду "Еўразія" "Развіцце газет на Украіне".Паводле вынікаў апытання, праведзенага спецыялістамі фонду, 22,7 % чытачоў аддаюць перавагу раённым газетам, 51,5 % – гарадскім і абласным. Падчас семінара галоўныя рэдактары адзначылі, што фінансавыя праблемы ўзнікаюць у звязку з тым, што 70 % грошай ад падпіскі забірае "Укрпошта" і толькі 30 % застаецца на выданне і развіццё.

На пачатку сакавіка, як паведаміла УНІАН, па распараджэнні "нейкіх высокіх начальнікаў" на першым паверсе рэдакцыі газеты "Киевские ведомости" былі пастаўлены супрацоўнікі так званай "дзяржаўнай аховы". Па словах супрацоўнікаў выдання, штатным ахоўнікам "Киевских ведомостей" прыйшлося перамясціцца на паверхі вучэбнага будаўнічага камбіната, дзе рэдакцыя арандуе кабінеты. Як мяркуюць журналісты, такім чынам, магчыма, пачалася "падрыхтоўка" да закрыцця газеты. У любы момант прадстаўнікі дзяржаўнай аховы могуць перакрыць уваход у рэдакцыю "Киевских новостей".

Саюз пісьменнікаў Украіны лічыць "смяротнай пагрозай" для дзяржавы прыход у новы парламент левых і прарасійскіх партый і блокаў, а таксама мафіёзных кланаў. У звароце да ўкраінскага народа пісьменнікі падкрэсліваюць, што прыход да ўлады гэтых сілаў будзе вызначаць абранне Украінай " пагібельнага беларускага шляху" і страту ёю незалежнасці. У заяве адзначаецца, што спадзяванні трэба звязваць толькі з сіламі, якія "безагаворачна, душой і целам адданыя ўкраінскай зямлі".

Сёння на Украіну робіцца значны інфармацыйны націск з боку іншых дзяржаў, у прыватнасці, з боку Расіі,— заявіў у інтэрв"ю журналістам намеснік сакратара Савета нацыянальнай бяспекі і абароны Украіны, дырэктар Нацыянальнага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксандр Бялоў. Па яго словах, "прычынай гэтага з"яўляецца недастаткова канкурэнтаздольная інфармацыйная прастора Украіны". Спадар Бялоў падкрэсліў неабходнасць як мага больш хуткага стварэння "надзейна абароненай і канкурэнтаздольнай інфармацыйнай прасторы, якая ўключае сістэмы статыстыкі і рэгістрацыі падзей". На яго думку, кожны суб"ект дзяржавы павінны атрымаць свабодны доступ да інфармацыі. Усе гэта "з"яўляецца галоўным фактарам уплыву Украіны на іншыя інфармацыйныя прасторы".

Дзяржаўная мытная служба Украіны заявіла, што не мае дачынення да затрымання замежных, у першую чаргу расійскіх газет і часопісаў. Па інфармацыі прэс-цэнтра Дзяржмытні, у адпаведнасці з пастановай Кабінета Міністраў Украіны "Аб рэалізацыі Пагаднення паміж урадам Украіны і ўрадам Расійскай Федэрацыі аб свабодным гандлі" з 1 лютага 1998 года мытнае афармленне тавараў паходжаннем з мытнай тэрыторыі Украіны ў выпадках іх увозу на гэту тэрыторыю, ажыццяўляецца без спагнання НДС і ўвазной пошліны. Такім чынам, за расійскія перыядычныя выданні не выплачваюцца ні пошліна, ні 20 % НДС, як сцвярджае "Укрпошта", а таксама некаторыя сродкі масавай інфармацыі.

Як заявіў 19 сакавіка на пасяджэнні клуба рынкавых рэформаў старшыня падатковай адміністрацыі Мікалай Азараў, у адміністрацыю звярнуліся галоўныя рэдактары перыядычных выданняў з просьбай перагледзець стаўкі падаткаабкладання. Сёння, зазначыў ён, ГПАУ рыхтуе свае прапановы, якія будуць вынесеныя на разгляд Вярхоўнай Рады.

ВЕСТКІ З РЭГІЁНАЎ

ГОМЕЛЬШЧЫНА

- На заўважных месцах у аддзяленнях сувязі Гомеля вывешаныя спісы беларускіх выданняў, на якія могуць падпісацца гараджане. Аднак у гэтым пераліку адсутнічаюць незалежныя газеты: "Народная воля", "Имя", "Навіны", "Белорусская деловая газета". У той жа час дзяржаўнае прадпрыемства "Гомельаблпошта" праз начальнікаў аддзяленняў сувязі пад пагрозай звальнення прымушае паштальёнаў за ўласныя грошы "набіраць" планавую колькасць перыядычных выданняў. Паштальены вымушаны выпісваць найбольш танныя газеты, кшталту "На рынке труда", "Зорька", і штоквартальна трацяць на гэта да 500 тысяч рублёў.

- Каб дагадзіць выканаўчай уладзе, ад якой фінансава залежаць рэгіянальныя выданні, мясцовы друк заняўся адкрытымі інсінуацыямі і дэзінфармацыяй. Асабліва што тычыцца легітымнага Вярхоўнага Савета 13-га склікання.

- Лельчыцкая раённая газета "Светлае жыццё" (№21, 14 сакавіка г.г.) у перадавым артыкуле "Чалавек – вышэйшая каштоўнасць" напісала, што "да выбрання першага Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі высокія словы Канстытуцыі заставаліся не больш чым дэкларацыяй. Аб іх рэальным увасабленні былая ўлада клапацілася менш за ўсе. Акрамя таго, Канстытуцыя 1994 года давала пэўным сілам прастору, асабліва для аматараў гаварыць, паказаць сябе. Успомнім, якія шматгадзінныя спектаклі яны разыгрывалі перад тэлекамерамі ў Авальнай зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета..."

- Гомельская гарадская арганізацыя БНФ пачала выдаваць інфармацыйна-аналітычную газету "Навіны Палесся - плюс". Газета фарматам А-4 выходзіць два разы ў месяц накладам 299 асобнікаў. Рэдагуе яе старшыня гарадской арганізацыі БНФ Уладзімір Старчанка.

БЕРАСЦЕЙШЧЫНА

- У Брэсцкім гарвыканкаме ўведзена пасада яшчэ аднаго намесніка старшыні, на якую прызначаны Аляксандр Працэвіч (былы дырэктар сярэдняй школы). Абавязкі новага намесніка – курыраванне прэсы, грамадскіх арганізацыяў, рэлігійных канфесіяў. Супрацоўнікі СМІ называюць новую службу "ідэалагічным аддзелам".

- Брэсцкі абласны Саюз прадпрымальнікаў актывізуе працу з мясцовымі журналістамі. У яго сёлетніх планах – правядзенне конкурсу сярод рэгіянальных выданняў прадпрымальніцкага кірунку і фотавыставы пра лідэраў брэсцкага бізнесу. На справаздачна-выбарчай канферэнцыі Саюза адным з прыярытэтных кірункаў яго дзейнасці названа "праца са сродкамі масавай інфармацыі", у звязку з чым пры Брэсцкім абласным саюзе прадпрымальнікаў ствараецца інфармацыйна-аналітычная група.

ВІЦЕБШЧЫНА

- Усе нормы прафесійнай этыкі, ужо не кажучы пра арт. 5 Закона аб друку, які забараняе "выкарыстанне СМІ для распальвання сацыяльнай нецярпімасці", праігнаравалі аўтары артыкула "Зловещий призрак кровавого прошлого", які быў надрукаваны напярэдадні 80-й гадавіны абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі ў газеце Віцебскага аблвыканкама "Віцебскі рабочы". Урад БНР названы "кучкой предателей белорусского народа 25 марта 1918 года", якія дзейнічалі "по указанию кайзера Вильгельма, помогая немецким войскам уничтожать белорусский народ". А пра маючую адбыцца ў дзень свята маніфестацыю далёкія ад вывучэння гісторыі прапагандысты напісалі: "Шабаш под чужими знаме-нами, подаренными немецким гаутляйтером фон Кубэ, и под щитами с изображением чуждого нашему народу крестоносца".

- 13 сакавіка незалежная газета "Віцебскі кур"ер" папярэдзіла чытачоў, што наступны яе нумар будзе каштаваць не 6, а 8 тысяч рублёў. Выклікана гэта павышэннем коштаў на газетную паперу ў звязку з падзеннем курсу беларускага рубля. Дарэчы, у адрозненне ад афіцыйных газет, "Віцебскі кур"ер" і іншыя недзяржаўныя выданні не могуць спадзявацца нават на частковую кампенсацыю выдаткаў за кошт мясцовага бюджэту. Звароты "Віцебскага кур"ера" ў дзяржаўныя інстанцыі ні разу станоўчага выніку не далі. Між іншым, на падтрымку газет абласны Савет дэпутатаў асігнаваў упраўленню па друку Віцебскага аблвыканкама 12 мільярдаў бюджэтных рублёў. Але разлічваюць на гэта чамусьці толькі выданні, заснаваныя мясцовымі органамі прэзідэнцкай "вертыкалі".

- 26 сакавіка распаўсюджвальнік прэсы Юрый Карпаў, які накіроўваўся ў рэдакцыю "Віцебскага кур"ера" каб забраць частку тыражу, быў гвалтоўна затрыманы на лесвіцы грамадскага будынка супрацоўнікамі міліцыі. Спадара Карпава даставілі ў аддзяленне ўнутраных спраў Кастрычніцкага раёна Віцебска і падвергі вобыску. Адпусцілі толькі пасля таго, як склалі пратакол аб "непадпарадкаванні патрабаванням міліцыі". Падчас вобыску ў Карпава адабралі асабістыя дыскеты і супраць яго волі прагледзелі на міліцэйскім камп"ютэры.

ЮРАСЬ ЛЯШКЕВІЧ

МІФЫ НОВАЙ БЕЛАРУСІ

Будучы студэнтам факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта яшчэ давялося застаць тыя часы, калі айчынная навука называла мас-медыя не інакш як СМАП — сродкамі масавай агітацыі і прапаганды. Трэба сказаць, што гэта цалкам адпавядала тагачаснай ролі газет і тэлебачання. Але станаўленне дэмакратычнай дзяржавы, якое пачалося ў пачатку 90-х гадоў, унесла карэктывы перш за ўсё ў галіну грамадскіх зносін і вызначыла сапраўдныя функцыі прэсы. У выніку змяніліся не толькі назвы і накірункі газет, але і самі яны як ніколі дагэтуль наблізіліся да сусветных стандартаў дэмакратыі і сталі называцца сродкамі масавай інфармацыі.

Аднак мінула яшчэ некалькі гадоў, і пачаўся адкат назад. Нягледзячы на тое, што сукупнасць дзяржаўных беларускіх газет, радыё і тэлебачання па-ранейшаму сёння носіць нейтральную назву СМІ, функцыі агітацыі і прапаганды даўно засланілі іх галоўную задачу — праўдзівае і аператыўнае інфармаванне грамадства пра ўсебаковае жыццё краіны і свету. Адначасова з гэтымі тэндэнцыямі пераважная большасць беларускіх СМІ, якія трапілі пад уплыў уладных інстытутаў, стала інструментам маніпуліравання грамадскай думкай. Не сустракаючы сур'ёзнай крытыкі, гэтая функцыя нават набыла рысы першачарговай, што зводзіць да мінімуму дэмакратычныя прынцыпы, якія афіцыйна аб'явіла беларуская дзяржава.

Маніпуліраванне дазваляе ўладам, з аднаго боку, ствараць бачнасць захавання дэмакратыі, а з другога, звяртаючыся да падсвядомасці людзей, кіраваць грамадствам у адпаведнасці са сваімі інтарэсамі, змагацца з палітычнымі праціўнікамі, усталёўваць новыя "каштоўнасці". Яно сапраўды нясе большую небяспеку для грамадства, чым простая прапаганда і агітацыя, якія ўжо самі ператварыліся ў інструменты маніпуліравання. Нябачнае кіраванне свядомасцю і паводзінамі людзей, якія і не падазраюць пра гэта, ставіць мэтай прымусіць іх дзейнічаць ці бяздзейнічаць нават насуперак уласным інтарэсам. У звязку з чым яно па эфекту ўздзеяння наогул блізкае да замбіравання.

Асновай маніпуліравання з'яўляюцца сацыяльна-палітычныя міфы, якія ўмела распрацоўваюцца ідэолагамі кіруючых колаў, а потым шырока "актуалізуюцца" падуладнымі сродкамі масавай агітацыі і прапаганды. Асаблівасць міфаў у тым, што ілюзія падаецца як неаспрэчная ісціна, як аксіёма. Яны атрымліваюць шырокае распаўсюджанне без сур'ёзнай аргументацыі.

Калі прыгадаць мінулыя часы, то менавіта такімі міфамі былі сцверджанні аб загніваючым капіталізме, аб светлай савецкай будучыні, кіруючай ролі камуністычнай партыі, аб непазбежнасці кастрычніцкай рэвалюцыі, аб "ворагах народа" і безліч іншых.

Здаецца, вочы грамадства раскрыліся на гэты падман. Але ўрокі гісторыі, як бачна, не пайшлі на карысць і нічому не навучылі. Бо новыя міфы, ужо з беларускай прапіскай, якія прыйшлі на змену старым, хутка прыжываюцца на айчыннай глебе. Грамадства, якое выхоўваецца на масавай культуры, так і не здолела знайсці вакцыны супраць нядаўняга зла. І колькасць новых ілюзій ужо не паддаецца падліку. Вось толькі некаторыя распаўсюджаныя ўстойлівыя сцвярджэнні, якія зараз ужо не аспрэчваюцца ў большасці СМІ. Хаця іх, без сумненняў, можна аднесці да катэгорыі штучна створаных сучасных міфаў: маўляў, "без эканамічнага саюза з Расіяй Беларусь не выжыве" (дарэчы, грамадства ужо рыхтуюць да міфа аб неабходнасці палітычнага альянса), "апазіцыя шкодная, яна ўвесь час рыхтуе змовы супраць уладаў", "прэзідэнту перашкаджаюць ворагі", "народ Беларусі падтрымаў новую рэдакцыю Канстытуцыі", "Еўропа не ведае рэальнай сітуацыі ў нашай краіне", "новы парламент прызнаны ва ўсім свеце", "у краіне зніжаецца беспрацоўе", "узмацняецца барацьба са злачыннасцю", "растуць макраэканамічныя паказчыкі" і г. д. Маштаб гэтых міфаў самы розны: ад "смяротнай небяспекі з боку НАТО" да "трох целаахоўнікаў прэзідэнта".

Для таго, каб укараніць падобныя перакананні ў свядомасць грамадства, выкарыстоўваюцца не толькі нахабная падтасоўка фактаў, замоўчванне праўдзівай інфармацыі, распаўсюджванне падману і паклёпу. Існуюць і больш тонкія сродкі. Напрыклад, каб забяспечыць давер людзей, афіцыйныя СМІ выкарыстоўваюць метад паўпраўды: аб'ектыўна і падрабязна асвятляюцца малазначныя падзеі, а больш важныя пры гэтым замоўчваюцца ці наогул падаюцца ў ілжывай інтэрпрэтацыі.

Некаторыя мясцовыя "каментатары" добра навучыліся наклейваць ярлыкі. Для кампраметацыі пэўных ідэй і канкрэтных асоб яны бяздоказна прыводзяць абразлівыя вызначэнні накшталт "фашыстаў", "нацыяналістаў" ці "агентаў ЦРУ". Акрамя таго, ёсць шмат прыёмаў лінгвістычнага маніпуліравання, калі шляхам выкарыстання моўных сродкаў адну і тую ж падзею можна адлюстраваць як ў белым, так і ў чорным колеры. Апроч усяго, БТ падчас мантажу выбірае асаблівыя ракурсы, калі адны асобы падаюцца надзвычай непрываблна і нават непрыстойна, а іншыя — вельмі станоўча.

Маніпуліраванне ўмела іграе на заканамернасцях масавай псіхалогіі беларускага грамадства, якое ў гэтым выпадку часта разглядаецца як адно цэлае. Асабліва гэта адчуваецца тады, калі выкарыстоўваюцца сродкі сацыялагічных апытанняў. Так, спасылаючыся на папярэдне "апрацаваныя" вынікі апытання грамадскай думкі, афіцыйныя СМІ імкнуцца пераканаць людзей у падтрымцы большасцю грамадства той ці іншай пазіцыі ці асобы, што прымушае грамадзян, якія прытрымліваюцца іншых поглядаў, замоўчваць ці мяняць свае перакананні. На гэтым жа фоне голас большасці здаецца мацнейшым, што прымушае нязгодных перайсці на "агульнапрынятую" пазіцыю. Менавіта такая карціна назіраецца зараз на Беларусі.


Аднак магчымасці маніпуліравання не бязмежныя. Супрацьстаянне гэтай заганнай з'яве існавала і будзе існаваць. Трэба толькі помніць, што ілюзіі заўсёды абапіраюцца на масавую свядомасць, на стэрэатыпы, менталітэт і погляды людзей. А вынік маніпуліравання залежыць першнаперш ад маштаба кантралюемых уладамі сродкаў масавай інфармацыі і грамадскіх інстытутаў. Таму альтэрнатывай, гарантыяй ачышчэння інфармацыйнай прасторы ад лухты і нахабнай хлусні павінна стаць развіццё незалежных СМІ і іх аўдыторыі. Прычым непадуладныя кіруючым колам СМІ павінны разумець сваю ролю ў станаўленні дэмакратычнага грамадства і прафесійна, аргументавана развейваць створаныя ўладамі міфы. Сёння, калі колькасць незалежных беларускіх СМІ ў параўнанні з дзяржаў-

ИРИНА ДЕНИСОВА

РЕГИСТРАЦИЯ? ЭТО НЕ БОЛЬНО...

най прапагандысцкай машынай надзвычай мізэрная, рабіць гэта вельмі складана. І тым не менш...

У арсенале незалежнай прэсы праўда, а значыць — і будучыня. Будучыня вольнага, без прапагандысцкай заангажаванасці і хлусні, нацыянальна свядомага і адкрытага грамадства.



малюнак А. Карповіча

Новый закон о печати, с поправками, дополнениями и изменениями, вступил в силу.

Теперь мы, коллеги-журналисты, учредители-издатели, будем жить по новому законодательству. А его лучше знать в лицо и максимально подробно. Предлагаем вам интервью Ирины ДЕНИСОВОЙ с начальником управления правового обеспечения Госкомитета Республики Беларусь по печати Игорем КОВАЛЕМ.

–Игорь Николаевич, означает ли вступление в силу нового закона обязательную перерегистрацию всех СМИ? Мы были убеждены: этот повод будет использован, чтобы частым бреднем пройтись по реестру республиканских изданий и отсеять так называемые "оппозиционные СМИ". Имеют ли основания эти опасения?

– Однозначно заявляю – перерегистрация никому не грозит. Разве что в обычном порядке, если меняются учредители или по другим причинам. Но мы потребуем представить нам учредительные документы: устав редакции, решение о ее создании.

– Проясните, пожалуйста, вызывающий массу недоразумений вопрос: обязательна ли регистрация редакций в исполкоме?

– Не всегда. Издание может учреждать организация, юридическое лицо либо любой гражданин. И требования к регистрационным документам разные. Как поясняет толковый словарь, организация – это объединение людей, совместно реализующих какую-то программу, цель, действующих на основе определенных правил и процедур. Очень широкое, как видите, понятие. Это может быть общественное или политическое движение, любая "группа товарищей". Такая организация может быть нигде не зарегистрирована. Чтобы реализовать своё конституционное право на свободу слова, она может выпускать свой печатный орган – тиражом до 300 экземпляров. Для издания таких СМИ мы не требуем никаких документов. Объединяйтесь в организацию – и издавайтесь. Так гласит закон о печати. Дальше. Положим, редакция организуется в виде юридического лица. Наше законодательство различает два вида юридических лиц – те, которые относятся к субъектам хозяйствования (АО, ЗАО, ООО, частные или государственные предприятия и так далее). Второй вид – юридические лица, не являющиеся субъектами хозяйствования. Это религиозные организации, общественные объединения, политические партии. Они должны получить свой статус, к примеру, в Минюсте либо Госкомитете по делам религии и национальностей. А если юридическое лицо, не являющееся субъектом хозяйствования, редакция – её устав утверждаем мы, таким образом придавая ей законный статус.

Если учредителем выступает гражданин – к нему никаких особых требований закон о печати при регистрации не предъявляет. Пусть приходит с паспортом, заполняет заявление, и мы зарегистрируем его издание.

ИРИНА ДЕНИСОВА
РЕГИСТРАЦИЯ? ЭТО НЕ БОЛЬНО...

– Но если он выступает в качестве издателя, пусть даже собственного СМИ, он же должен быть хотя бы частным предпринимателем?

– Это не наши вопросы. Закон о СМИ не требует, чтобы мы интересовались, есть ли у гражданина, который собирается учредить газету, удостоверение ЧП.

Если редакция – юридическое лицо, не являющееся субъектом хозяйствования, она вправе заниматься хозяйственной деятельностью, но очень ограниченно – выпускать только свое издание, которое обозначено в его регистрационном удостоверении.

Если же вы зарегистрированы как субъект хозяйствования в исполкоме, и в вашем уставе предприятия (ЗАО, ООО и так далее), наравне с другими видами деятельности, записано, что вы можете издавать газету, журнал, любое другое СМИ – пожалуйста. Как всякий субъект хозяйствования, вы проходите регистрацию в исполкоме в установленном порядке, а потом приходите в Госкомитет по печати со своим уставом, и мы регистрируем ваше СМИ. В законе о печати сказано, что устав редакции может одновременно являться и уставом предприятия. Либо наоборот – устав предприятия может быть и уставом СМИ.

– Что понимается под "решением о создании редакции", которое учредители должны вам представить вместе с уставом?

– Это может быть приказ, распоряжение, выписка из протокола правления, общего собрания, если учредитель – единственное юридическое лицо. Но если учредителей несколько – это обязательно должен быть учредительный договор, которым регламентируются ваши права и обязанности, ответственность и другие вопросы издания СМИ.

– Что нового появилось в регламенте регистрации?

– Два момента. Теперь в заявлении нужно указывать периодичность издания и более четко декларировать его тематику. Поясню. Раньше можно было писать очень расплывчато, что издание будет, например, "описывать жизнь района", "освещать деятельность партии" и так далее. Теперь введен ГОСТ 7-060-93, где перечислена тематика изданий: официальные, научные, научно-политические, морально-этические, искусство, детские, подростковые, справочные, для досуга, литературно-художественные, религиозные, рекламные и эротические. В заявлении учредитель должен указывать тематику своего издания так, как она звучит по ГОСТу. Можете написать даже все сразу – пожалуйста.

– Сроки, в течение которых Госкомитет рассматривает заявление, остались прежними?

– Да, месяц. Но если необходимы дополнительные документы, мы вправе еще на месяц продлить рассмотрение вашего заявления.

– Что вы имеете в виду под "дополнительными документами"?

– Только то, что предусмотрено ст.8 Закона "О печати ...". Учредителями СМИ, например, не могут быть партии, общественные объединения, деятельность которых запрещена. Мы должны проверить в Минюсте, действительно ли организации, которые хотят учредить СМИ, продолжают оставаться "легитимными". Не может быть учредителем и гражданин другого государства, не проживающий постоянно, то есть две трети года, на территории РБ. Но, как вы сами понимаете, это проверить очень сложно. Человек может жить в разных местах, постоянно ездить.

Новый пункт в законе о СМИ гласит, что в течение двух лет со дня вступления в силу решения суда не могут выступать в качестве учредителей СМИ юридические или физические лица, чьи издания закрыты в судебном порядке. Не станет учредителем и лицо, отбывающее наказание. Все это нужно дополнительно проверить.

– Говорят, теперь при регистрации издания Госкомитет требует какую-то справку из исполкома. Это надо понимать так, что исполком может разрешить, а может и не разрешить газету или журнал?

– Мы не требуем справку из исполкома о целесообразности учреждения самого СМИ. Мы заинтересованы, чтобы в заявке был указан настоящий, а не мнимый, как это бывает сейчас, адрес будущего издания. Ну и, в конце концов, исполком должен знать о том, что на его территории существует такое-то издание. То есть исполком должен дать разрешение только на его "прописку". Кстати, это требование содержится в ст.10 Закона "О печати..."

– Ходят слухи о регистрации информационных агентств, правда ли это?


– Возникла ситуация, когда некоторые газеты делают ссылку на информационные агентства, которые просто невозможно найти. Регистрироваться они все должны как субъекты хозяйствования, то есть через исполком. Агентство – это и редакция, и издатель, и распространитель в одном лице. И потому подпадает под регламент многих законов: о печати, об издательской деятельности, о предприятиях и предпринимательской деятельности.

После того как положение о регистрации информационых агентств вступит в силу, любая ссылка СМИ на незарегистрированное агентство будет неправомочной, и отвечать за опубликованную информацию придется именно газете или журналу.

– Спасибо за интервью.

("Фемида NOVA", 12.02.98г.)

ВАЛЕРИЙ ШУКИН
«ЖЕГЛОВЫ» И «ШАРАПОВЫ» БЕЛОРУССКОЙ МИЛИЦИИ



Валерий Щукин

Более полувека мои контакты с милицией были довольно редки и незначительны: участковый, паспортный стол, постовой. Даже работа в столь «грозной» комиссии Верховного Совета, как национальная безопасность, оборона и борьба с преступностью, мало что изменила в наших отношениях — мое внимание сосредоточено было в основном на армии. И лишь 1996 год поставил нас лицом к лицу. Являюсь по убеждению народником, то есть сторонником народовластия, и вследствие этого, не мог принять средневековый абсолютизм, возврат к которому стал осуществлять на Беларуси глава исполнительной власти. Потому в соответствии со своими моральными принципами в ноябре 1996 года оказался среди защитников демократии, а так как я — офицер, то встал в первый ряд борцов сопротивления. Тактика правящего на Беларуси режима — нейтрализация впереди идущих. Именно на них сосредоточены все средства устрашения и преследования, имеющиеся на вооружении у власти: увольнения, резиновые дубинки, насильственные приводы в милицию, судебные процессы, штрафы, опись имущества, административные аресты... Пройдя через все это, прочувствовав на собственной шкуре в прямом смысле данного слова, видя в течение многих месяцев работу милиции на улицах, в отделах, в управлениях и, наконец, в арестантских камерах, получил о людях в милицейской форме значительные представления, которые дают мне моральное право делать определенные выводы.

В кинофильме «Место встречи изменить нельзя» показаны два противоположных по моральным и нравственным критериям послевоенных милиционера: Жеглов и Шарапов. Первый — готов переступить через закон, процессуальные и моральные нормы, совершить по отношению к преступнику подлость во имя того, чтобы вор сидел в тюрьме. Второй — действует строго по закону, и критерий презумпции невиновности подозреваемого является для него основополагающим. О соотношении «жегловых» и «шараповых» среди милиции в те годы судить не берусь. Да и время было иное. А мы ушли на 40 лет вперед, осудили тоталитарность. С тех пор сменилось уже два поколения сотрудников органов правопорядка. Но в ходе многомесячных сражений за независимость я тоже сталкивался как с «жегловыми», так и с «шараповыми». Ныне, накануне второго тысячелетия, мыслящий, имеющий чувство собственного достоинства человек усвоил, что создать и поддержать в обществе установленный законом порядок, нарушая Конституцию и законы страны, невозможно. К сожалению, не понимает и не стремится осознать это глава белорусского государства.

Советский милиционер 50-х годов Жеглов, столь блестяще изображенный Владимиром Высоцким в фильме, беспощаден к тем, кого считает уголовниками. Шараповское милосердие он не понимает. Но и тот и другой, не щадят своей жизни во имя людей, охраняя их от посягательств преступников. Белорусский милиционер образца 1997 года действует по иным морально-нравственным принципам. Он беспощаден, в первую очередь, к тем, кто не угоден официальной власти по политическим мотивам. У преемника Жеглова и задача особая — оберегать покой Президента от граждан, а законы для многих сотрудников МВД — анахронизм. Ведь руководствуется страж порядка не ими, а подзаконными актами — указами и декретами главы государства.

. Но тогда это уже не милиционер, а опричник («опричнина» — система чрезвычайных мер для разгрома оппозиции и специальные войска для этого). 2 апреля 1997 года мировое сообщество увидело телефотокадры, как современные опричники окружают и безжалостно избивают во время манифестации белорусских граждан и журналистов, которые выполняли, согласно закону, свой профессиональный долг.

Для сравнения приведу цитату из характеристики, многократно звучащей в телесериале



ВАЛЕРИЙ ШУКИН
«ЖЕГЛОВЫ» И «ШАРАПОВЫ» БЕЛОРУССКОЙ МИЛИЦИИ

«Семнадцать мгновений весны»: «Беспощаден к врагам Рейха». Только ведь Рейх — это не Адольф Гитлер. Нынешние белорусские «жегловы» тоже беспощадны, но не к врагам страны или махровым преступникам, а к гражданам и политическим оппонентам, которые имеютточку зрения, отличную от президентской.

10 марта 1997 года на площади Независимости в Минске милиция пыталась спровоцировать беспорядки: людей силой сгоняли к Красному костелу. Понятно, что по распоряжению «высокого» начальства.




интервью
после очередногосуда

И приказ, безусловно, должен был быть выполнен, но только делали это по-разному. В то время как «шараповы» лишь сдерживали возмущенных граждан, один из «жегловых» кулаком яростно считал мои ребра.

1 апреля того же года другой «жеглов» в майорском звании лично руководил заталкиванием Валерия Щукина в милицейский УАЗик. Однако в этой же машине «шарапов» приподнимал с пола и поддерживал руками мою голову, давая возможность дышать, а на судебном процессе честно и прямо заявил, что оснований у милиции хватать журналиста В.Щукина не было. Но зато в другом суде очередной «жеглов» в звании старшего лейтенанта, демонстрируя беспощадность к политическому противнику режима, показывал судье, в каком месте проезжей части улицы он «видел» В.Щукина среди демонстрантов. И это в то время, когда я, в присутствии десятков свидетелей, шел строго по тротуару и переходил улицу исключительно на зеленый сигнал светофора.

Наиболее ярким образчиком «жеглова-97» может служить безусый милиционер, сделавший 2 апреля прошлого года в Центральном РОВД столицы заявление о готовности задавить собственного отца, если тот выступит против президента. А образцом «шарапова»-97 для меня навсегда останется пожилой старшина милиции, который ясно отдавал себе отчет, что рискует быть выброшенным из органов МВД до пенсии, но тем не менее сказал судье о незаконности действий своего начальства.

Находясь в течение 10 суток на «президентской гауптвахте», имел возможность наблюдать «жегловых» и «шараповых» в условиях, предоставляющих им дополнительные возможности проявить свою мораль и нравственность. В столичном политГУЛАГе «жегловы» поступали точно так, как многократно показанные в художественных фильмах эсэсовские надзиратели фашистских концлагерей. Вели себя по отношению к находящимся в камерах согражданам, как представители высшей «расы» к существам, которые находятся на низшей ступени развития. На каждый, даже робкий стук из камеры президентские «жегловы» издавали звериный рык,- любая незначительная просьба арестованного дать таблетку или сказать, который час, приводила этих сержантов-«сверхчеловеков» в ярость. А запас слов у них не превышал лексикон Эллочки-людоедки из романа «12 стульев», да и большинство этих выражений в словарях отсутствует. Единственное отличие — резиновая дубинка вместо «шмайсера». «Шараповы» из минского спецприемника вели себя по отношению к арестованным по-человечески, стараясь повозможности не усугублять тяготы пребывания за решеткой. Рассказывать об их благодеяниях не стоит, чтобы не подвергнуть преследованию конкретных людей. Добавлю лишь то, что в отличие от своего кинопрототипа «шараповы»-97 против бесчинств, творимых в спецприемнике их сослуживцами, открыто не выступали.



стихийная акция протеста
журналистов в защиту
группы ОРТ
напротив МИДа
(31. 07. 97)

Надеюсь, что прочитав данную статью, начальствующий и рядовой состав МВД задумается: кто же каждый из них — «жеглов» или «шарапов»? А я, как член высшего представительного органа народовластия республики, адресую этот вопрос сотрудникам всех правоохранительных органов и силовых структур.


Грамадства, якое хоча жыць і пасяхова развівацца, павінна аналізаваць і ўлічваць гістарычны досвед. Асабліва пільна і ўважліва трэба зважаць на трагічныя перыяды ў гісторыі краіны, каб пазбегнуць іх вяртання. Масавыя рэпрэсіі 1920–1950-х гадоў прывялі народ Беларусі да дэмаграфічнай, духоўнай і маральнай катастрофы.

Яе наступствы дагэтуль не пазбытыя ў свядомасці многіх людзей, у сучаснай дзяржаўнай палітыцы і практыцы. Напрыканцы XX ст. у Беларусі пашыраюцца рэпрэсіі і праследаванне па палітычных матывах. Увядзенне прэзідэнцкай формы кіравання стала пачаткам узнаўлення некаторых таталітарных структураў. Асабліва гэты працэс узмацніўся пасля так званага рэферэндуму 1996 г. У Беларусі не дзейнічае Канстытуцыя, падзаконныя акты набываюць сілу закону. Абмежаванні свабод і правоў чалавека тлумачацца вышэйшымі дзяржаўнымі інтарэсамі. Апошнім часам у грамадскую свядомасць укараняецца думка, што рэпрэсіі савецкага перыяду былі гістарычна непазбежнымі. Аднак нішто не можа служыць апраўданнем для забойства, знявагі чалавечай годнасці.

Адным з крокаў у распрацоўцы фундаментальнай канцэпцыі гісторыі палітычных рэпрэсій у Беларусі стала міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі ў XX стагоддзі", якая адбылася ў Мінску 27-28 лютага 1998 г. Заслухаўшы каля 40 дакладаў і паведамленняў, удзельнікі канферэнцыі прыйшлі да высноў:

1. Рэпрэсіі 1920–1950-х гадоў мелі масавы характар. У першую чаргу вынішчаліся людзі з нацыянальна-дэмакратычнай свядомасцю. Ад рэпрэсій пацярпелі ўсе слаі насельніцтва Беларусі – сяляне, навуковая і творчая інтэлігенцыя, рабочыя, святары і рэлігійныя дзеячы розных канфесій, вайскоўцы, прадстаўнікі так званых "эксплуататарскіх класаў", нацыянальных меншасцяў, сябры небальшавіцкіх партый і іншыя. Гэта быў сапраўдны генацыд савецкай улады супраць уласнага народа.

2. Ігнараваліся асноўныя правы чалавека – на жыццё, маёмасць, недатыкальнасць жытла, *на свабоду, слова і*



веравызнання, на працу. Рэпрэсіўныя органы дзяржавы пра-цавалі з выключнай жорсткасцю, з парушэннем усіх нормаў законнасці.


3. Сістэма ўлады, заснаваная на ўдушэнні асноўных правоў грамадзян, з"яўляецца злачыннай.

4. Рэабілітацыя пацярпеўшых зацягнулася на многія гады, асабліва марудна яна ідзе ў адносінах да тых грамадзян, якія адстойвалі прынцыпы беларускага патрыятызму і дзяржаўнасці.

5. Хаваліся і хаваюцца месцы масавай згубы людзей, робяцца захады для таго, каб звязаць іх са злачыннай дзейнасцю нямецкага фашызму.

З мэтаю кампенсацыі дзяржавай матэрыяльных, маральных стратаў рэпрэсіраваным і далейшага вывучэння гісторыі палітычных рэпрэсій на Беларусі ўдзельнікі канферэнцыі лічаць неабходным:

- узнавіць сістэму дзяржаўных ільгот для ахвяраў палітычных рэпрэсій;
- за кошт дзяржаўнага і мясцовага бюджэтаў увекавечыць памяць загубленых людзей на месцах іх масавых расстрэлаў – Курапаты, Лошыца, Чэрвень, Вілейка, Магілёў, Мазыр, Гомель і інш.;
- распрацаваць карту месцаў масавых рэпрэсій і пахаванняў ахвяр на тэрыторыі краіны і ўзяць іх пад ахову дзяржавы;
- забяспечыць свабодны доступ даследчыкаў, якія вывучаюць гісторыю палітычных рэпрэсій, да рассакрэчаных архіваў КДБ, паскорыць іх перадачу ў Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь;
- стварыць на дзяржаўным узроўні структуру па збору і апрацоўцы ўспамінаў, фота і іншых дакументаў і матэрыялаў аб рэпрэсіях супраць народа Беларусі з мэтаю ператварэння яе ў далейшым у музей памяці ахвяр палітычных рэпрэсій;
- стварыць часовы творчы калектыў па падрыхтоўцы энцыклапедычнага слоўніка-даведніка "Палітычныя рэпрэсіі супраць народа Беларусі ў XX ст." (сумесна з навукоўцамі Польшчы, Расіі, Украіны).



Урочышча Курапаты. Прастрэлены чэрап і чалавечыя косці. (1990г.)

Удзельнікі канферэнцыі выказалі свой пратэст супраць парушэнняў правоў чалавека і дэмакратычных нормаў на Беларусі, рэпрэсій па палітычных матывах, праследавання незалежных сродкаў масавай інфармацыі.

г.Мінск, 28.02.98г.

УЛАДЗІМІР ДЗЮБА

КУРАПАТЫ: МІНУЛА ДЗЕСЯЦЬ ГАДОЎ

4 сакавіка 1998 года споўнілася 10 гадоў, як грамадскасць упершыню даведалася пра трагедыю ва ўрочышчы Курапаты. У гэты дзень сябры Беларускай асацыяцыі журналістаў запалілі свечкі памяці на месцы бязвінна закатаваных і забітых суайчыннікаў.

Раскопкі тут праводзіліся з 1987 па 1990 год. І тады камісія на падставе знойдзеных рэчавых доказаў прыйшла да высновы, што ў Курапатах савецкіх грамадзян расстрэльвалі супрацоўнікі НКУС.

Нядаўна з"явілася яшчэ адна версія, што ва ўрочышчы пад Мінскам расстрэльвалі людзей падчас нямецка-фашысцкай акупацыі. Гэта версія таксама разглядаецца, і яе адстойвае так званая грамадская камісія. Таму восенню 1997 года пачалося паўторнае следства і пасля раскрыцця масавых пахаванняў, знойдзены новыя доказы крывавых рэпрэсій. Трэба зазначыць, што яны пакуль не абвяргаюць вынікаў ранейшых даследаванняў, — што да канца 30-х гадоў тут чынілі расстрэлы органы НКУС. Сёння Беларуская ваенная пракуратура праводзіць чарговае расследаванне, якім кіруе афіцэр Віктар Сомаў.

Папярэдне месцы масавых пахаванняў вызначаюць па правалах на паверхні зямлі. Сёння такіх западзін вызначана больш за 500. Пасля раскрыцця некаторых з іх аказалася, што тут знаходзіцца розная колькасць ахвяр: ад 20 да 35 чалавек. У адной з ямін знайшлі астанкі больш як 300 чалавек.

Хто і калі аддаў крывавы загад і забіў гэтых людзей? Ці будуць знойдзены і пакараныя каты? (Хтосьці з іх, безумоўна, жыве і, не выключана, атрымоўвае персанальную пенсію.) Калі гэта справа бальшавіцкіх "троек" і "двоек", ці прыйдзе дзень пакаяння? Мы хочам ведаць праўду. Бо толькі яна фармуе гістарычную памяць і гарантуе, што таталітарызм не паўторыцца.

Зрэшты, на ўсе гэтыя пытанні павінна адказаць следства. І вельмі прыкра, што некаторыя закасцянелыя прапагандысты з прэтэнзіяй на ісціну паспешліва друкуюць у дзяржаўных газетах агульнапрынятыя за камуністычным часам цынічны пункт гледжання. Маўляў, ва ўрочышчы Курапаты расстрэльвалі злачынцаў-крымінальнікаў ці, у крайнім выпадку, грамадзян польскай або яўрэйскай нацыянальнасцяў. Гэтыя паспешлівыя і нічым не абгрунтаваныя заявы падобныя на духоўны вандалізм і спрыяюць злачынствам, што ўчынілі ў Курапатах выродкі, калі раскапалі ўначы магілы і раскідалі астанкі, шукаючы спажыву.

На працягу доўгіх дзясяцігоддзяў трагедыі Катыньскага лесу таксама як бы і "не было". "Не захавалася", як пісала зусім нядаўна афіцыйная расійская прэса, і адпаведных архіўных дакументаў. Але неўзабаве яны "знайшліся" і былі перададзены польскім уладам. Гістарычная праўда, дзякуючы сумленным гісторыкам і журналістам, мусіла прабіцца праз наслаенні ідэалагічнай хлусні...




злева направа: Уладзімір Андронаў (WTN, міжнароднае агенцтва Сусветных тэлевізійных навін), Алесь Лукашук (радыё «Свабода»), Уладзімір Дзюба, Уладзімір Кармілкін (фотакарэспандэнт), Леанід Міндлін (WTN) Ігар Кузняцоў (гісторык)

По гэтай лясной дарозе, якае вядзе на ўзгорак, у канцы 30-х гналі людзей на расстрэл







Мемарыяльная лава ў Курапатах – падарунак прэзідэнта ЗША Біла Клінтана. Увесну 1996 г. яе пашкодзілі вандалы.

Сучасны «саўковы» вандалізм. Звалка ў Курапатах побач з масавымі пахаваннямі. (4 сакавіка 1998 г.)



Прэзідэнт Рэспублікі Польшча Лех Валенса на мітынгу ў Курапатах. (1990 г.)

КУРАПАТЫ



1998

Устаноўка крыжа пакутнікам Беларусі



Суботнік у Курапатах



1990

Вайна супраць СМІ

12 сакавіка

Адбылася сустрэча старшыні Дзяржаўнага камітэта па друку Рэспублікі Беларусь Міхаіла Падгайнага са студэнтамі факультэта журналістыкі Белдзяржуніверсітэта, дзе ён адзначыў, што не збіраецца займаць жорсткую пазіцыю ў дачыненні да недзяржаўнай прэсы і што ён абыякавы да таго, каму належыць тое ці іншае выданне. Маўляў, галоўнае, каб усё было па закону, а з гэтым, на думку Падгайнага, не ўсё ў парадку. Таму што за апошнія два з паловай месяцы камітэт зрабіў 40 папярэджанняў. Напрыклад, газета "Навіны" атрымала папярэджанне Дзяржкамдруку адразу пасля выхаду першага нумара за размяшчэнне на першай паласе лагатыпу закрытай газеты "Свабода". Атрымала папярэджанне і незалежная газета "Народная воля" за публікацыю артыкула Сямена Букчына аб перспектыве з"яўлення беларускай Полы Джонс. Падгайны таксама сказаў студэнтам, што дзяржаўным СМІ, асабліва раённым, вельмі не хапае маладых спецыялістаў. Мяркуецца, што сёлета правілы размеркавання будуць больш жорсткімі, а сам ён узначаліць адпаведную камісію.

13 сакавіка

Ваенізаваная служба аховы Брэсцкага машынабудаўнічага аб"яднання па распараджэнні кіраўніцтва стала рэгулярна правяраць сумку і кішэні наладчыка станкоў Самойленкі, які з"яўляецца сябрам Свабоднага прафсаюза Беларускага і распаўсюджвае газету СПБ "Рабочий". Калі служба аховы знаходзіць у Самойленкі прафсаюзнае выданне, яго не прапускаюць на прадпрыемства, пакуль рабочы ад яго не пазбавіцца.

13 сакавіка

Падчас прэс-канферэнцыі кіраўнік Міністэрства замежных справаў Беларусі Іван Антановіч значную частку свайго часу прысвяціў, па яго словах, хвалі атак расійскіх СМІ наконт унутранай і знешняй палітыкі Беларусі і асабіста ў адрас яе прэзідэнта. Па меркаванні міністра, развязаная ў СМІ кампанія супраць Лукашэнкі – гэта "спланаваная стратэгія супраць Беларусі. Мы вельмі абражаныя". Антановіч папярэдзіў акрэдытаваных у Беларусі журналістаў, што за "хлусню" іх могуць пазбавіць акрэдытацыі.

18 сакавіка

Адбыўся чарговы суд над вядомым дэпутатам-камуністам і карэспандэнтам газеты "Народная воля" Валерыем Шчукіным, які быў затрыманы міліцыяй 24 лютага. Нагадаем, што ў той дзень закончыўся суд над Вадзімам Лабковічам і Аляксеем Шыдлоўскім, якіх асудзілі за тое, што яны распісалі будынкі раённага горада Стоўбцы антыпрэзідэнцкімі лозунгамі. Ля Мінскага абласнога суда сабраліся грамадзяне, каб сустрэць вызваленага з-пад варты В. Лабковіча. Міліцыя адцясніла людзей ад будынка, а некалькіх затрымала, у тым ліку і В. Шчукіна. На судзе радавы супрацоўнік міліцыі заявіў, што выконваў загад свайго непасрэднага начальніка. Падчас перакрыжаванага допыту міліцыянер адказаў, што не ведаў, што Шчукін – журналіст і што журналіст, які выконвае свае прафесійныя абавязкі, мае права знаходзіцца ў "гарачых" кропках. У рашэнні суда было адзначана, што міліцыя не прадаставіла дастатковых

War against MEDIA

march 12

Mikhail Padgainy, chairman of the State Committee on the Press of Belarus, visited the journalism department at Belarus State University. He said that he was not going to take a tough policy towards the independent press. He also stated that it does not matter for him who is the owner of a newspaper. In the view of Padgainy the laws should be observed what is not always the case. Over the last couple of months the State Committee on the Press has issued 40 warnings. For instance, Naviny newspaper received a warning from the State Committee on the Press right after the first issue had come out. The newspaper was warned for using the closed down Svaboda's logo on the cover page. Narodnaya Volya was also issued a warning for publishing an article by Semoyn Bukchin about perspectives of Belarusian Pola Johnes to emerge. Padgainy also told the students that the state run media, especially regional newspapers, enjoys a serious shortage of young specialists. This year's assignment rules for journalism graduates are planned to get tougher, and Padgainy himself is to run a special commission.

march 13

Militarized guard service of the Brest engineering works following the instruction of the director began to check up personal bags and pockets of machine fixer Samoilenko who is a member of Free Trade Union of Belarus and distributes Rabochi (Worker) newspaper. When the guards find the copies of Rabochi on him, Samoilenko is not allowed to enter the plant until he gets rid of the newspaper.

march 13

At his press-conference Belarus Foreign Minister Ivan Antonovich devoted a major part of the time to "the waves of attacks by the Russian mass media against domestic and foreign policy of Belarus and, specifically, against Presdident Lukashenko. In the view of Antonovich, a campaign against Lukashenko in the Russian media is "a pre-arranged strategy against Belarus. We feel extremely offended". Antonovich warned the journalists accredited in Belarus that their "lies" can be grounds for canceling their accreditation.

march 18

Valeri Schukin, correspondent of Narodnaya Volya newspaper and well-known communist deputy, detained by police on 24 February, faced another trial. It should be reminded that on the same day the trial of Vadim Labkovich and Alexei Shydlovski finished. The youngsters were convicted for writing anti-presidential graffiti on the walls of administrative buildings at the town of Stolbtsy. People gathered near the building of Minsk Regional Court to greet released Labkovich. Police hustled the gathered away from the building. Several of them, Schukin included, were detained.

A police soldier said at the trial that he was executing the order of his direct commander. During cross-questioning he said that he did not know that Schukin was a journalist and that journalists have the right to carry out their

War against MEDIA Вайна супраць СМІ

доказаў (у ходзе судовага разбору такія доказы таксама не былі знойдзены), што дадзены сход грамадзянаў з'яўляўся несанкцыяніраваным і што патрабаванні супрацоўнікаў праваахоўных органаў да журналіста былі законнымі. У звязку з чым справа была спынена.

20 сакавіка

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па праблемах валютнага крызісу заявіў, што абвал беларускай валюты з"яўляецца толькі часткай "плана дэстабілізацыі эканамічнай і палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы". Ён таксама расказаў пра факты, якія сведчаць аб існаванні такога плана, і пра тое, што да гэтага плана "паслядоўна і звар"яцела падключаюцца... сродкі масавай інфармацыі на Захадзе і маскоўскія каналы, а таксама апазіцыйныя сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі".

22 сакавіка

У Мінску прайшло святкаванне 80-х угодкаў Дня незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі – Дзень Волі. Апазіцыйныя сілы правялі мітынг і шэсце. Пасля завяршэння мерапрыемстваў каля офіса Беларускага народнага фронту міліцыянеры чакалі людзей, якія вярталіся з мітынгу. Былі затрыманы карэспандэнт незалежнай газеты "Навіны" Альгерд Невяроўскі, карэспандэнт "Беларускай газеты" Ягор Маёрчык і супрацоўнік газеты "Гастраном" Руслан Бацянкоў. Некалькі чалавек у цывільным выскачылі з двух аўтамабіляў і прапанавалі паехаць у аддзяланне ўнутраных спраў Савецкага раёна. Службовыя пасведчанні, якія паказалі журналісты, намеру прадстаўнікоў сілавых структураў не змянілі: "Паедзем у пастарунак, там разбяромся", – адказалі супрацоўнікам СМІ. Пасля размовы з капітанам міліцыі ў пастарунку журналістаў адпусцілі.

23 сакавіка

Адбыліся суды над некаторымі ўдзельнікамі святкавання Дня незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі. Найбольш жорсткае пакаранне атрымалі віцебскія актывісты БНФ – рэдактар віцебскай газеты "Выбар" Барыс Хамайда і журналіст гэтага ж выдання Уладзімір Плешчанка. Яны былі асуджаныя на 10 сутак адміністрацыйнага арышту за спробу правесці несанкцыяніраваны пікет каля будынка адміністрацыі прэзідэнта і за тое, што пры затрыманні аказвалі супраціўленне супрацоўнікам міліцыі. Віцебскія журналісты разам з распаўсюджвальнікам незалежнай прэсы – таксама віцяблянінам – Юрыем Марозам паспрабавалі перадаць беларускаму прэзідэнту падарункі да Дня незалежнасці – некалькі папяровых бел-чырвона-белых буслоў.

24 сакавіка

Справа Паўла Шарамета і Дзмітрыя Завадскага разглядалася у Гродзенскім абласным судзе. Судовая калегія пад кіраўніцтвам суддзі Грынкевіча вырашыла пакінуць без змяненняў прыгавор Ашмянскага раённага суда, які прызнаў журналістаў ГРТ вінаватымі ў незаконным пераходзе беларуска-літоўскай мяжы падчас здымак тэлерэпартажу. Слуханне справы працягвалася дзве гадзіны. Адвакатамі былі прыведзеныя факты тэндэнцыйнасці раённага суда і абгрунтаванні для адмены прыгавора. Калегія абласнога суда ўважліва выслухала ўсе аргументы і пасля трыццаціхвіліннай нарады вынесла рашэнне – нічога не мяняць. Адвакат Паўла Шарамета Гары Паганяйла сказаў, што цяпер, калі прыгавор пакіне ў сіле і Вярхоўны суд Беларусі, яны будуць звяртацца ў міжнародны камітэт па правах чалавека, штаб-кватэра якога знаходзіцца ў Жэневе. Грамадзяне Беларусі маюць юрыдычныя падставы шукаць там абароны, паколькі Вярхоўны Савет ў студзені 1992 года ратыфікаваў пратакол № 1 пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

25 сакавіка

Па ініцыятыве Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь галоўнага рэдактара газеты "Навіны", а таксама кіраўнікоў іншых незалежных выданняў выклікалі да галоўнага пракурора рэспублікі. Выклік звязаны з публікацыяй інтэрв"ю беларускага бізнесмена Аляксандра Пупейкі, выдачы якога па абвінавачванні ў буйных грашовых махінацыях патрабуюць беларускія праваахоўныя органы. Гэты матэрыял (інтэрв"ю ў Пупейкі ўзяў Янка Чурыловіч, які ў канцы 1997 года атрымаў статус палітычнага ўцекача і з"яўляецца карэспандэнтам некалькіх польскіх газет) быў передрукаваны беларускай незалежнай прэсай з польскай газеты ("Жыцце"), дзе беларускі бізнесмен заявіў пра існаванне замежных рахункаў беларускага прэзідэнта. Падчас размовы з пракурорам журналісты даведаліся, што за перадрукоўку гэтага інтэрв"ю газеты могуць быць пакараныя за знявагу гонару і годнасці прэзідэнта.

26 сакавіка

Рэдакцыя газеты "Феміда-NOVA" атрымала ліст ад Дзяржаўнага камітэта па друку за подпісам міністра Міхаіла Падгайнага. У пісьме адзначалася, што газета рэгулярна публікуе Указы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы ўрада, нарматыўныя акты міністэрстваў і ведамстваў. Падгайны паведаміў, што 13 студзеня 1998 года адпаведнай пастановай № 42 пералік ліцэнзуемых відаў дзейнасці дапоўнены. Цяпер, як патрабуе адзін з раздзелаў гэтага дакумента, павінна ліцэнзавацца і "дзейнасць па распаўсюджванні прававой інфармацыі". Ліцэнзіі выдае Міністэрства юстыцыі па ўзгадненні з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі (НЦПІ), які падпарадкоўваецца Адміністрацыі прэзідэнта. У сваю чаргу Мінюст павінны быў распрацаваць і зацвердзіць палажэнне аб парадку і выдачы ліцэнзій. На 16-га сакавіка палажэнне яшчэ праходзіла этап узгаднення. Намеснік міністра юстыцыі растлумачыла ў гутарцы з карэспандэнтам выдання, што калі газета адмовіцца ад публікацый афіцыйных тэкстаў дэкрэтаў, указаў і г.д., то можа абысціся і без ліцэнзіі.

Паводле інфармацыі БАЖ і Архіва Найноўшай гісторыі

professional duties at "hot spots". The court ruled that police did not submit enough evidence to prove that the people's assembly could be identified as a unsanctioned meeting and the police abuse was lawful. As a result, the case against Schukin was dismissed.

march 20

President Lukashenko said at the urgent meeting on financial crisis that the collapse of Belarusian currency was only a part of the " plan on destabilization of economic and political situation in the republic". He also told about the fact which prove the existence of such a plan and that "Western media along with Moscow TV channels and the opposition media in Belarus have been getting consistently and madly involved in the realization of this plan".

march 22

A demonstration to mark the 80th anniversary of the Independence Day of Belarusian People's Republic was held in Minsk. After the event near the office of Belarusian Popular Front police was expecting people returning from the demonstration. Correspondents Algerd Neviarouski of Naviny, Jahor Maerchyk of Belaruskaya Gazeta and Ruslan Batiankou of Gastronom newspaper were detained. Several men in civilian clothes jumped out of two cars and suggested the journalists to follow them to a police station of Sovetski district. IDs shown by the journalists did not change the police intentions. "We will take you to a police station for clarification", the journalists were told. After the talk with a police captain, the journalists were released.

march 23

Several demonstrators which participated in celebrating the Independence Day of Belarusian People's Republic were tried. Belarusian Popular Front's activists Barys Hamaida, chief editor of Vitebsk based "Vybar" (Choice) newspaper and Uladzimir Pleshchanka of the same newspaper faced the most severe prosecution. They were sentenced to 10 days of administrative arrest for attempting to hold a unsanctioned picket near the building of president's administration as well as for resisting to the police. Vitebsk journalists along with Yuri Maroz, distributor of the independent press, attempted to pass to Belarus President the Independent Day gifts – several white-red-white paper storks.

march 24

Hrodna Regional Court considered the case of Pavel Sheremt and Dzmitry Zavadski. The court session presided by judge Grynkevich ruled that the decision of Ashmiany Disrict Court remain unchanged. The ORT journalists were found guilty in illegal crossing of Belarus-Lithuanian border during the filming. The hearings lasted for 2 hours. The defense submitted the evidence of the district court's bias and provided grounds for revoking the sentence. The Regional Court's session attentively listened to all arguments and after a half-an-hour meeting ruled that nothing be changed. Sheremet's defense lawyer Hary Pahaniaila said that if the Supreme Court takes the same decision, they are going to appeal to the International Human Rights Court based in Geneva. Citizens of Belarus have legal grounds to seek the protection there as the Supreme Court ratified on 22 January 1992 the protocol N1 of International Human and Civil Rights Pact.

march 25

Editor-in-chief of Naviny newspaper and several others from the independent newspapers were summoned to the Procurator General of Belarus. The summons were caused by publishing an interview by Belarusian businessman Alexander Pupeiko which is charged with financial fraud and wanted by Belarusian law-enforcement bodies. This interview (taken by Janka Churylovich which in late 1997 was given a political asylum and works for several aPolish newspapers) was reprinted by the Belarusian independent press from the Polish newspaper "Zycie" in which the Belarusian business stated about the existence of Belarus President's account in foreign banks. The Procurator General told the journalists that their newspapers can face criminal prosecution for insulting the honor and dignity of the President.

march 26

Femida NOVA newspaper received a letter from the State Committee on the Press signed by Minister Mikhail Padgainy. The letter said that the newspaper regularly published the Decree of Belarus President, Government's resolutions. Padgainy said that since in accordance with the Provision N42 dated 13 January 1998 the list of activities which require license had been supplemented. The provisions of this document set out that "dissemination of legal information must be licensed as well". The licenses are issued by the Ministry of Justice in agreement with the National Center of Legal Information (NCLI) which is subordinate to the president's administration. The Ministry of Justice had to elaborate and adopt the rules of issuing licenses. By 16 March the draft rules had been in the process of accommodation. Deputy Minister of Justice explained to a Femida NOVA correspondent that if the newspaper refused to publish official legal documents, there would be no need for a license.

Sources: BAJ Monitoring and the Modern History Archive

ИГОРЬ МУФЕЛЬ
ПРОСТО ГОРОДСКИЕ НОВОСТИ



***Виктор Андреев**, главный редактор оршанской газеты «Кутейна».*

Стоял у истоков создания организации БНФ в Орше в 89 году. В 91 году во время массовых забастовок был избран секретарем городского стачкома. Вел переговоры с Верховным Советом о снятии блокады железной дороги. В 93-м занимался созданием первых организаций независимого профсоюза. В настоящее время председатель Оршанской региональной организации Свободного профсоюза Белорусского.

В Орше, там, где речка Кутейна впадает в Днепр, стоит монастырь. В XVII веке здесь был напечатан первый белорусский букварь и Лексикон.. Монастырские затворники, последователи Франциска Скорины, заботились о распространении грамоты и печатного слова. Люди в те давние времена были любознательны и страдали от недостатка информации. Через триста лет печатное слово стало приходить к грамотным читателям тысячными тиражами. Но вот беда, в отличие от изданий первопечатников нынешняя печатная продукция зачастую служит не столько для распространения информации, сколько для ее сокрытия. Например, там же, на берегах Кутейны и Днепра, тиражом 9 тысяч экземпляров печатается издание под названием «Оршанская газета». Четыре полосы заполнены вестями с полей, вестями с заводов. Много вестей, но нет информации. Бедные читатели! Как считает мой собеседник Виктор АНДРЕЕВ, за триста лет люди не стали менее любопытными.

Видел бы ты первые номера нашей «Кутейны». Мы начали выпускать ее еще в 89-м году. Печатали газету на пишущей машинке, потом фотографировали и распространяли фотографические снимки большого формата. Потом в 91-м вышло несколько номеров, уже отпечатанных в типографии. Однако денег у нас не было, и поэтому выпуск газеты пришлось прекратить.

Я всегда был убежден, что городу нужна независимая местная газета, которая, не мудрствуя лукаво, писала бы о местных новостях подробно и объективно. У нас в городе есть государственное издание, которое так и называется «Оршанская газета». Она абсолютно неинтересная, потому что редактор руководствуется принципом "как бы чего не вышло". Дело даже не в цензуре. Он государственный служащий и, как в былые времена, боится потерять место, если будет недостаточно хорошо освещать линию партии. Открываешь эту газету — и как будто возвращаешься на 20 лет назад: вести с полей, вести с заводов, новые успехи трудовых коллективов. Но людям нужна информация. Они покупают газету хотя бы для того, чтобы прочитать на последней странице, кто умер и кто выражает соболезнование. Я думаю, что массовая городская газета не должна быть оппозиционной. Ее дело — информация, городские новости. Впрочем, сегодня просто объективная информация уже оппозиционна.

В прошлом году дело сдвинулось с мертвой точки. Мы создали Региональный центр поддержки развития демократических преобразований имени Филона Кмиты. (Филон Кмита – известная историческая личность, оршанский староста XVI века). И этот центр стал учредителем газеты «Кутейна».

Ты представляешь себе, какой может быть общественная жизнь в провинциальном городе? У

ИГОРЬ МУФЕЛЬ
ПРОСТО ГОРОДСКИЕ НОВОСТИ

нас 140 тысяч жителей, но не действует ни одна политическая партия, кроме БНФ. Есть несколько демократических общественных организаций, женская организация, «Товарищество белорусского языка», Свободный профсоюз, молодежная организация «Рша». Все они ужасно бедные, только у Свободного профсоюза есть какие-то средства. Мы решили объединиться, чтобы хоть как-то поддерживать друг друга. Выпускать газету без посторонней помощи нам, разумеется, было бы не под силу. Помогает Институт поддержки демократии на Беларуси, который находится в Польше. Но этих денег хватает только на типографские расходы. И это при том, что мы выходим всего раз в две недели тиражом 1000 экземпляров. А надо было бы выпускать газету хотя бы дважды в неделю тиражом 8-10 тысяч экземпляров. В том, что такой тираж будет расходиться, я не сомневаюсь.

Мы надеемся найти средства и утешаем себя тем, что пока мы учимся делать настоящую газету. Сегодня она еще довольно поверхностна, в ней мало информации, той самой, ради которой затевалось дело. Все сотрудники работают на общественных началах. Не беда, что у нас нет профессиональных журналистов. Я знаю, хорошего профессионала трудно найти даже в Минске. Причем это не только белорусская проблема. Коллеги из Польши мне рассказывали, что у них сплошь и рядом в региональных газетах нет профессионалов.

Газету распространяем бесплатно. Наверно, следовало ее продавать, хотя бы в целях престижа, и люди наверняка бы покупали. Но как только мы начнем брать деньги, сразу влезем в налоговые дебри. Придется нанимать бухгалтера. Будет ли доход, неизвестно, но проблемы будут точно.

Отдельно надо сказать о молодежной странице газеты. Молодежи некуда пойти в таком небольшом городе, как наш, нечем заняться в свободное время. Создан БПСМ, государственная структура, туда особенно никто не рвется. Идет тот, кто хочет сделать карьеру. Но есть такие, которые не хотят их карьеры. Они объединились в молодежную организацию «Рша». Проводят концерты, ходят в турпоходы, очень интересуются белорусской историей и белорусскими традициями. Мы предоставили им целую полосу в газете.

Ты спрашивал, как городские власти к нам относятся? Да пока никак, потому что газета их мало задевает. Мало еще у нас острой информации. Однако молодежная страничка уже удостоилась внимания. Один студент (в Орше есть филиал юридического института) написал статью об исторических названиях улиц города и высказал мысль о том, что не худо бы к ним вернуться. Так вот к директору этого студента пришел человек из КГБ и потребовал вызвать парня. Знаешь, как он представился? Начальник отдела по защите конституционного строя! Представился и стал спрашивать парня, кто его подталкивает писать статьи такого рода? Представляешь, какое давление на молодого человека?!

Ты обязательно спросишь про ограбление. Ничего конкретного я сказать не могу. Возможно, это был заурядный криминал. Однако что у нас вынесли? Компьютер, модем, факс, телефон. А что оставили? Монитор и дорогую электродрель, которая лежала на видном месте и стоила куда дороже телефона. Если рассуждать логически, получается, что нас хотели лишить связи. Удар при нашей бедности был необыкновенно тяжелым. Но мы будем выходить. Мы должны выходить, потому что людям нужна информация — просто городские новости.

В заключение остается добавить, что не так давно Витебский областной совет выделил дополнительно полмиллиона долларов для поддержки местных СМИ, разумеется, государственных. Иными словами, еще полмиллиона даны на сокрытие информации.

ЛАБОРАТОРИЯ “ NOVAK”

МОНИТОР, 28 января- 5 февраля 1998 РЕПРЕЗЕНТАТИВНАЯ ВЫБОРКА 1100 чел.

НАСКОЛЬКО ВЫ ДОВЕРЯЕТЕ ГОСУДАРСТВЕННЫМ И ОБЩЕСТВЕННЫМ ИНСТИТУТАМ И ОРГАНИЗАЦИЯМ?

РЕСПУБЛИКА

	ДОВЕРЯЮ	НЕ ДОВЕРЯЮ	НЗ/ЗО	НЕТ ОТВ.
ЦЕРКОВЬ	69,6	17,7	11,8	0,9
АРМИЯ	59,5	30,2	10,3	0
ПРЕЗИДЕНТ	57,7	30,6	11	0,8
ГОСУДАРСТВЕННЫЕ СМИ	47,6	44,2	7,4	0,8
ПРАВИТЕЛЬСТВО БЕЛАРУСИ	47	37,7	14,5	0,8
ПРАВОСУДИЕ	43,1	43,7	13,1	0
НЕЗАВИСИМЫЕ СМИ	37,1	42,5	18,8	1,6
МЕСТНЫЕ ВЛАСТИ	36,5	52,2	10,4	0,8
ТРАДИЦИОННЫЕ ПРОФСОЮЗЫ	34,3	45,6	19,1	0,9
МИЛИЦИЯ	34,1	58,4	6,8	0,8
НАЦ.СОБРАНИЕ (В ЦЕЛОМ)	24,7	39,4	34,2	1,6
НЕЗАВИСИМЫЕ ПРОФСОЮЗЫ	23,4	34	40,5	2,1
СОВЕТ РЕСПУБЛИКИ	21,8	40,4	36,4	1,5
СОЮЗ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ Р	21	41,1	37,1	0,9
ПАЛАТА ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ	20,8	41,1	37,4	0,8

МИНСК

	ДОВЕРЯЮ	НЕ ДОВЕРЯЮ	НЗ/ЗО	НЕТ ОТВ.
ЦЕРКОВЬ	73,9	18,1	7	0,9
АРМИЯ	61,8	31,1	7,1	0
ПРЕЗИДЕНТ	45,2	45,8	9,5	0
ГОСУДАРСТВЕННЫЕ СМИ	41,5	53,7	4,8	0
ПРАВИТЕЛЬСТВО БЕЛАРУСИ	30,8	57,3	12	0
ПРАВОСУДИЕ	40	50,4	9,6	0
НЕЗАВИСИМЫЕ СМИ	52,1	35,1	12,8	0
МЕСТНЫЕ ВЛАСТИ	25	61,4	13,3	0,3
ТРАДИЦИОННЫЕ ПРОФСОЮЗЫ	30,7	51,1	17,7	0,4
МИЛИЦИЯ	32,2	65,6	2,2	0
НАЦ.СОБРАНИЕ (В ЦЕЛОМ)	21,8	51,6	26,6	0
НЕЗАВИСИМЫЕ ПРОФСОЮЗЫ	28,5	40,2	31,2	0
СОВЕТ РЕСПУБЛИКИ	20,3	53	26,7	0
СОЮЗ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ Р	30,3	37,6	32	0
ПАЛАТА ПРЕДСТАВИТЕЛЕЙ	23,2	51,6	25,3	0

КАК ВЫ ДУМАЕТЕ, НАСКОЛЬКО ВОЗМОЖНЫ СЕЙЧАС В ВАШЕМ ГОРОДЕ (РАЙОНЕ) МАССОВЫЕ ВЫСТУПЛЕНИЯ ПРОТИВ РОСТА ЦЕН И ПАДЕНИЯ УРОВНЯ ЖИЗНИ?

	РЕСПУБЛИКА	МИНСК
Вполне возможны	23,9	40,4
Маловероятны	65	48,5
Затрудняюсь ответить	7,6	6
Нет ответа	3,5	5,2

ЕСЛИ СОСТОЯТЬСЯ МИТИНГИ, ДЕМОНСТРАЦИИ ПРОТИВ РОСТА ЦЕН И ПАДЕНИЯ УРОВНЯ ЖИЗНИ, ВЫ ЛИЧНО ПРИМЕТЕ В НИХ УЧАСТИЕ?

	РЕСПУБЛИКА	МИНСК
Скорее всего да	24,1	25,1
Скорее всего нет	63,9	61,5
Затрудняюсь ответить	8,4	7,3
Нет ответа	3,5	6,1

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ О СУЩЕСТВОВАНИИ ОБЩЕСТВЕННОЙ ИНИЦИАТИВЫ ХАРТИЯ- 97?

	РЕСПУБЛИКА	МИНСК
Да, знаю	12	17,2
Нет, не знаю	77,2	75,7
Затрудняюсь ответить	7,6	2,5
Нет ответа	4,0	4,7



Международный конкурс эссеистики

Устроители: журнал Леттр Интернациональ и Ваймар 1999-Город культуры Европы ГмбХ.

В конкурсе могут принять участие люди во всем мире, которым предлагается вступить в творческое соревнование за наиболее убедительный ответ. На пороге нового тысячелетия этот международный конкурс должен стать символом творческого и кооперативного мирового общества XXI века.

Формулировка конкурсного вопроса:

Освободить будущее от прошлого?

Освободить прошлое от будущего?

Премии:

Первые три лауреата получают денежные премии

(1-я премия 50 000 ДМ, 2-я премия 30 000 ДМ, 3-я премия 20 000 ДМ)

и приглашаются в 1999 г. на вручение в Ваймар.

Лауреаты, а также другие авторы наиболее интересных текстов получают рабочую стипендию в Германии на несколько месяцев.

Эссе лауреатов и подборка эссе, выбранных заключительным жюри, будут опубликованы в разноязычных изданиях журнала Леттр Интернациональ, а также в других международных культурных журналах.

Предусматривается публикация эссе, выбранных заключительным жюри, в виде книги на немецком и других языках.

Условия участия:

- Участвовать в конкурсе могут все желающие, за исключением членов жюри и сотрудников Леттр Интернациональ и Ваймар 1999-город культуры Европы.
- Эссе должны быть представлены на одном из шести языков ООН: английском, арабском, испанском, китайском, русском и французском или на языке устроителя – немецком.
- Представленные эссе не могут быть опубликованы вплоть до дня вручения премий, предложены для публикации третьим лицам или представлены на другие конкурсы.
- Эссе должны быть присланы в Секретариат международного конкурса эссеистики не позднее 30 ноября 1998 г. в двух машинописных экземплярах или переданы по e-mail. Определяющей является дата почтового штемпеля или протокола e-mail.
- ***Рукописи не возвращаются.***
- Авторы премированных эссе передают устроителям неограниченное и переносимое на третьих лиц право на перевод, размножение и распространение представленных ими эссе – в том числе частями – на всех языках.
- Авторы, тексты которых были предложены на заключительное жюри, но не были премированы, также передают устроителям права на публикацию. В случае публикации их эссе они получают одноразовый гонорар в размере 500 ДМ. В случае публикации в виде книги все авторы получают дополнительный авторский гонорар в пределах 8% участия с продажной цены книги в зависимости от доли их эссе в общем объеме книги.

Продолжение на обороте

